**МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

Праспект Пераможцаў, 11, 220004, г. Мінск

тэл. (017) 203 75 74, факс (017) 203 90 45
E-mail: ministerstvo@kultura.by

**МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

Проспект Победителей, 11, 220004, г. Минск

тел. (017) 203 75 74, факс (017) 203 90 45
E-mail: ministerstvo@kultura.by

10.04.2017 № 01-19/04-257
На № _________ от _________

Махнач У.А.
vladimir.m.0208@gmail.com

Аб разглядзе звароту

Разгледзеўшы калектыўны зварот адносна ўнясення змяненняў у праект зон аховы гісторыка-культурнай каштоўнасці «Месца згубы ахвяр палітычных рэпрэсій (1930 – 1940-я гады) ва ўрочышчы Курапаты», паведамляем наступнае.

Прыняцце ў 2014 годзе рашэння аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у распрацаваны праект зон аховы гісторыка-культурнай каштоўнасці «Месца згубы ахвяр палітычных рэпрэсій (1930 – 1940-я гады) ва ўрочышчы Курапаты Мінскага раёна Мінскай вобласці» ажыццёўлена ў сувязі з распрацоўкай горадабудаўнічай дакументацыі стадыі “Дэталёвы план” і неабходнасцю прывядзення ў адпаведнасць з прынятым у 2006 годзе Законам Рэспублікі Беларусь “Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь”. Праект зон аховы быў распрацаваны з улікам вынікаў археалагічных даследаванняў, праведзеных ў 2013 годзе ДНУ “Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі” на тэрыторыі паміж лясным масівам Курапаты і межамі ахоўнай зоны , архіўных і бібліяграфічных звестак і існуючай горадабудаўнічай сітуацыі.

Зацвярджэнне Міністэрствам культуры прапаноў па змяненні і (або) дапаўненні праекта зон аховы магчыма ў выпадку выяўлення новых гістарычных звестак, якія мяняюць уяўленне аб характары антрапагеннага і (або) прыроднага навакольнага асяроддзя, і падрыхтоўцы ў вызначаным заканадаўствам парадку абгрунтаваных прапаноў, якія павінны ўключаць тлумачальную запіску з гістарычнымі звесткамі, матэрыялы аналізу тэрыторый, зыходзячы з вызначанага характару іх уздзеяння на аб’ект спадчыны, апісанне межаў зон аховы да існуючых устойлівых планіровачных або прыродных аб’ектаў. Межы зон аховы гісторыка-культурнай каштоўнасці павінны быць нанесены на чарцёж з планіроўкай тэрыторыі ў маштабе 1:5000 – 1:500. Распрацоўку праектаў зон аховы, а таксама прапаноў па ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у іх, павінны выконваць праектныя

арганізацыі, якія маюць у сваім складзе спецыялістаў, кваліфікацыя якіх пацверджана пасведчаннем на кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях.

Паколькі дадзены матэрыялы не былі прадстаўлены, падрыхтоўка Міністэрства культуры адпаведнага тэхнічнага нарматыўнага прававога акта не прадстаўляецца магчымай.

Па інфармацыі, атрыманай з Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, работы побач з будынкам па вул.Мірашнічэнкі, 49 у г.Мінску прыпынены.

Забарона дзейнасці на тэрыторыі, якая не з'яўляецца гісторыка-культурнай каштоўнасцю і не размешчана ў зонах яе аховы, не адносіцца да кампетэнцыі Міністэрства культуры.

Дадзены адказ на зварот можа быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым часткаю першай пункта 1 артыкула 20 Закона Рэспублікі Беларусь «Об обращениях граждан и юридических лиц».

Намеснік Міністра А.А.Яцко

11 Ходар 209 47 83